# Маладзечна – Мінск: дыялог культурных сталіц

***З 10 па 30 жніўня ў мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» (Палац Рэспублікі) праходзіць выстава аўтарскіх эксклюзіўных трыкатажных мадэляў «Свой стыль» дызайнера з Маладзечна Людмілы Хрол.***

Гэтым праектам Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў далучыўся да Рэспубліканскай акцыі «Маладзечна – культурная сталіца Беларусі 2016 года» і разам з дабрачынным фондам «Спадчына Міхала Клеафаса Агінскага» прадставіў мінчанам цікавыя дызайнерскія творы: лёгкае адзенне, сумкі, аксесуары, верхняе адзенне.

Як адзначыла куратар выставы, сябра Беларускага саюза мастакоў Ларыса Фінкельштэйн, «на гэтай выставе кожны твор, створаны аўтарам смела і крэатыўна, незвычайна гармануе з выставачнай прасторай і ўступае ў дыялог з гледачом...».

У гэты вечар мастачку прыйшлі павіншаваць родныя, сябры і калегі з дзвюх сталіц – Мінска і Маладзечна. А маладзечанцы над творчым кіраўніцтвам старшыні аб'яднання «Светач» Палаца культуры горада Маладзечна Ларысы Сысун падрыхтавалі літаратурна-музычны вечар для гасцей. Сярод іх, дарэчы, было шмат знакамітых асобаў – прыхільнікаў творчасці Людмілы: народны артыст Беларусі, прафесар Уладзімір Экнадыёсаў, экс-старшыня Рэспубліканскай калегіі адвакатаў, генерал-лейтэнант Мікалай Шаліма, дырэктар Рэспубліканскага цэнтра нацыянальных культураў Вольга Антоненка і іншыя. Наведалі выставу і госці са Злучаных Штатаў Амерыкі Таццяна і Яцэк Вольскія.

Універсітэт і галерэя і надалей плануюць падтрымліваць творчыя стасункі з маладзечанскімі творцамі.

*Павел САПОЦЬКА,*
*дырэктар мастацкай галерэі «Універсітэт культуры»*
*Фота Цімафея ХРОЛА*



*Мастак з Амерыкі Тац… …льская і дыза… …юдміла Хр…*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ